В. О. Гаргома

# ЯН КАРАЛЬ ХАДКЕВІЧ І ЯГО ПАЛІТЫЧНАЯ, ГРАМАДСКАЯ І ВАЕННАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

Разглядаюцца важнейшыя вехі жыцця і дзейнасці таленавітага палкаводца ВКЛ.

Ян Караль Хадкевіч – адзін з найталенавіцейшых палкаводцаў беларускай зямлі. У сваёй палітычнай дзейнасці адстойваў суверэнітэт Вялікага Княства ў складзе Рэчы Паспалітай.

Нарадзіўся Ян Караль Хадкевіч каля 1560 г. у сям'і стольніка літоўскага, вядомага магната, дзяржаўнага дзеяча Вялікага Княства Літоўскага Яна Геранімавіча Хадкевіча. Яго дзед, Геранім Хадкевіч (1500 – 1561 гг.), быў кашталянам віленскім і ўваходзіў у склад Паноў-Рады Вялікага Княства Літоўскага.

Ян Караль Хадкевіч належаў да старэйшай, быхаўскай, галіны роду і ад бацькі атрымаў у спадчыну тытул графа на Шклове, Мышы і Быхаве. Вучыўся ў Віленскай іезуіцкай акадэміі, потым у Баварыі, ў Інгальштацкай акадэміі, дзе вывучаў філасофію і права. Вандраваў па Еўропе, бываў акрамя Германіі ў Англіі, Францыі, Італіі. Ваяваў у Нідэрландах пад началам герцага Альбы на баку іспанскага караля Філіпа ІІ супраць гёзаў. Пасля паехаў на Мальту для вывучэння ваеннага мастацтва, дзе азнаёміўся з дзеяннем артылерыі, з агняпальнай зброяй, фартыфікацыяй і правіламі аблогі фартэцый.

У 1595 – 1596 гг. удзельнічаў у падаўленні казацкіх выступленняў у Беларусі.

Але найбольш удала раскрыўся яго талент як ваенаначальніка ў час шматгадовай вайны Швецыі з Рэчу Паспалітай за Лівонію ў 1600 – 1621 гг. У 1601 г. пры актыўным удзеле польнага гетмана Яна Хадкевіча Крыштоф Радзівіл выйграў бітву са шведамі пад Кокенгаўзенам. Ян Караль са сваім атрадам вызваліў Трэйдан і Зыгвалт, удзельнічаў у абароне Рыгі. 25 верасня 1601 г. з атрадам у 2300 воінаў каля мястэчка Белы Камень, недалёка ад Дэрпта, ён разграміў атрад шведаў і немцаў з 7300 чалавек. У гэты час Хадкевіч пасля смерці Крыштофа Радзівіла назначаецца вялікім гетманам Вялікага Княства Літоўскага. Агульнаеўрапейскую славу і прызнанне заслужыў вялікі гетман Ян Хадкевіч пасля жорсткай кровапралітнай бітвы каля вёскі Кірхгольм за 2 мілі ад Рыгі, дзе ён 27 верасня 1603 г. з 7-ю тысячамі воінаў разбіў ушчэнт шведскае войска з 14 тысяч чалавек. 16 сакавіка 1609 г. вялікі гетман у бітве пад Пярнаў зноў атрымаў перамогу, захапіўшы ў шведаў два караблі з гарматамі. 27 верасня таго ж года ў бітве каля Дынамюндэ ён зноў разбіў 14-тысячнае войска шведаў, праз некаторы час – 6 лістапада – зноў перамога над 6-тысячным шведскім атрадам. Патрэбна асабліва падкрэсліць, што шведскае войска адпавядала патрабаванням таго часу, але вайсковы талент Хадкевіча апярэдзіў час.

Я.К. Хадкевіч, уцягнуты ў клубок каралеўскіх інтрыг, на чале войска Рэчы Паспалітай увосень 1611 г., летам 1612 г. і ўвосень 1617 – 1618 гг. прымаў удзел у паходах на Маскву. У гэтых ваенных акцыях, дзе яму давялося сутыкнуцца з кіраўнікамі апалчэння Дз.Пажарскім і К. Мініным, вялікі гетман праявіў надзвычайны тактычны і стратэгічны талент і асабістую мужнасць. Але гэтыя паходы пацвердзілі яшчэ раз гістарычную ісціну: якім бы ні быў таленавітым военачальнік, якімі б ні былі мужнымі ягоныя воіны, але калі падняўся супраць іх народ, дык перамогі стануць паражэннем. Народ нельга перамагчы.

Але сапраўды вечную славу заваяваў Ян Хадкевіч сабе і Айчыне перамогай над войскам Асманскай імперыі, якая была адной з мацнейшых дзяржаў як Еўропы, так і Азіі і Афрыкі. Пад яго кіраўніцтвам войска Рэчы Паспалітай у 1621 г. каля замка Хоцін (цяпер Украіна) разбіла полчышчы турэцкага султана Асмана ІІ. Пад камандай гетмана было амаль 40 тысяч чалавек. Войска Турцыі па колькасці намнога пераўзыходзіла войска Рэчы Паспалітай і складала, па турэцкіх звестках, 257000 чалавек. Калі ўлічваць, што да гэтага войска пад Хоцін увесь час падыходзілі папаўненні, дык яно намнога перавышала прыведзеную туркамі лічбу і складала 300000 - 400000 чалавек. Праўда, на дапамогу Яну Хадкевічу ў апошні час прыйшлі запарожскія казакі – па адных звестках 48, па другіх – 30 тысяч чалавек. Больш месяца – з 2 верасня па 8 кастрычніка – працягвалася Хоцінская бітва. І ўсё ж, такі перамога была за Хадкевічам. 24 верасня 1621 года Яна Хадкевіча не стала. Памёр ён на полі бітвы пад Хоцінам, яшчэ незадоўга да смерці правёўшы апошні ваенны савет.


1. Грыцкевіч, А. Хадкевічы/ А. Грыцкевіч // Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя. У 2 т. Т. 2: Кадэцкі корпус – Яцкевіч. – Мінск: БелЭн, 2006. – С. 710.
2. http://berestovitsa.grodno-region.by/ru/region/ber/yan


*Гаргома Владислав Олегович,* студент ФИТиУ. *vladgargoma@mail.ru*
*Научный руководитель: Николаева Людмила Викторовна,* зав.каф. гум. дисц., к. и. н., доцент.

Библиотека БГУИР